

Таццяна Цвірко

# Сэрца песню шукае...

Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Таццяна ЦВІРКО

# СЭРЦА ПЕСНЮ ШУКАЕ...

вершы

2023

Электронная бібліятэка
Мінскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*Серыя заснавана ў 2023 годзе*

Пад рэдакцыяй Р. Ю. Малахоўскага

№ 005

**Цвірко Т. К.**

Сэрца песню шукае: вершы / Таццяна Цвірко. — Мінск : МАА СПБ, 2023. — 93 с. (Электронная бібліятэка).

“Сэрца песню шукае…” – так называецца электронны паэтычны зборнік Таццяны Цвірко, у якім сабраны творы, напісаныя ў розныя гады. Кніга мае чатыры тэматычныя раздзелы, што змяшчаюць вершы-роздумы, для якіх характэрна духоўная напоўненасць і філасофскае адценне, вершы патрыятычнага і грамадзянскага гучання, вершы пра каханне, яго сілу і непрадказальнасць… Яны напісаны не толькі традыцыйнай вершаванай формай, але і формай верлібра, трыялета, таму чытач зможа выбраць сабе творы па густу і атрымаць асалоду ад прачытанага. Увогуле, сэрца паэткі адгукаецца на ўсе жыццёвыя драбніцы і не стамляецца шукаць новыя вобразы для лірычных твораў, якія яна пяшчотна называе “песняй” і без якіх, як прызнаецца аўтар, ёй “не жыць”.

© Цвірко Т. К., 2023
© Падрыхтоўка, афармленне.
ГА “Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі”, 2023

## *Сэрца песню шукае…*

*   *   *

Дрэва корань пускае
глыбока-глыбока.
Вецер лісце шугае
далёка-далёка.
Снег сабой наталяе
зямлю напрадвесні.
Сэрца песню шукае –
Не жыць мне без песні!

**МОВА**

Чаму я мову гэтую абрала?
Пытанне, мабыць, не знайду лягчэй.
Мяне матуля “донечкаю” звала
З выразным цвёрдым беларускім “чэ”.

Чаму я мову гэтую абрала?
На ёй мне шэпча казкі вецярок.
На ёй салоўку ўлетку падпявала
Пра “аксамітны зорны вечарок”

Чаму я мову гэтую абрала?
У творчы свет з яе вянок пляту.
Яе ўслаўлялі Колас і Купала,
І мілагучней мовы не знайду!

*   *   *

Усё ў жыцці бывае ўпершыню.
І першы смех, і першы крок, і слова “мама”.
І першы клас, і першае "люблю",
і першы верш калісьці быў таксама.

Калісьці быў. Пад спеў душы маёй
ён нарадзіўся кволы і няўдалы.
А Муза, што сплялася з цішынёй,
маёю спадарожніцаю стала.

Упэўнена з ёй па жыцці іду.
І не ўяўляю: жыць інакш ці можна?
Радок з радком у новы верш сатку.
Дай, Божачка, каб толькі не апошні!

## МАЁ ДЗЯЦІНСТВА

Маё дзяцінства пасвілася ў лузе
Сярод духмяных зёлак-знахароў,
Сярод пчаліных гімнаў вечнай Музе
І вальсаў летуценных матылькоў.

Маё дзяцінства "рэхалася" ў лесе
Сярод палян з грыбных капелюшоў,
І непаўторных салаўіных песень,
І мудрых казак баюноў-дубоў.

Маё дзяцінства песцілася ў полі
Ля каменя, дзе ціха б'е крыніца.
Дзе Маці Божая, спусціўшыся паволі,
Прысела некалі – вады жывой напіцца…

## ПРЫЙДЗІ, ПАЭЗІЯ!

Прыйдзі, я не здзіўлюся,
Калі парой начною
Табою акраплюся,
Як золкавай расою.
Уляці ў акно бяссоннае
Ты птушкаю параненай.
Сярод зімы сцюдзёнае
Сцяліся рунню ранняю.
Прыйдзі ў сны-небыліцы
Вяшчункай асляпляючай.
У сэрца бліскавіцай
Прарэжся, апякаючы.
Прыйдзі! Святой, сапраўднаю.
Суцішанай. Гарэзлівай.
Нястомнай. Беззаганнаю…
Прыйдзі, прыйдзі,
Паэзія!

*   *   *

Калі на душы невыносна смыліць,
Сама сябе ціхенька цешу:
Кармлю адзіноту з далоняў сваіх
То плачам, то сумам, то вершам.

## ВОСЕНЬСКІ НАСТРОЙ

Шэры змрок за акном,
На гадзінніку – восем.
Хтосьці паліць касцёр –
Пацягнула дымком …
Восень.
Шэры змрок на душы.
На жыцці – трыццаць восем.
Шмат задач, шмат праблем –
Ці змагу іх рашыць,
Восень?
На нябёсы зірну –
Сярод шэрані – просінь.
Сшытак, ручку вазьму,
Ціха Музе шапну:
“Восень”!

*   *   *

Нанізваю радкі
на каралі рабінаў,
на лісці-зоры клёнаў,
на бабіналетавае павуцінне…
На сум,
            на трывогі,
                        на надзеі…
Разумею:
ніхто не прачытае іх.
Але за шчасце
прадчуваць
духоўную свабоду і
подых
прасвятлення.

**ГОСЦЯ ЖАДАНАЯ**

Роўна-роўненька сыплюцца літары
На лісточкі старога нататніка.
І натхненне вольнаразлітае
Па задумках пырхае мятлікам.
А ці спраўдзіцца, а ці народзіцца
Самабытнае і геніяльнае?
Думкі спорнымі гронкамі коцяцца…
Зноў малююць звыкла-банальнае.
Ночка волкая, поўная містыкі,
З-пад палы выпускае ўжо раніцу.
Не, не быць мне, відаць, мадэрністкаю…
Выціраю слязу-неслухмяніцу.
Хоць гуляе на ногу шырокую
Арытмія неўтаймаваная.
Неба ў лужынах – хмельнавокае,
Мне паэзія – госця жаданая!

## ТРЫЯЛЕТ

Анёл-ахоўнік мой, ласкавым будзь,
Хвалюйся за душу маю зямную.
Трымай мяне, нястрымную такую…
Анёл-ахоўнік мой, ласкавым будзь.
Пра мой характар дзёрзкі не забудзь
І пра няўрымслівасць маю людскую.
Анёл-ахоўнік мой, ласкавым будзь,
Хвалюйся за душу маю зямную.

## МАЛІТВА

Зберажы мяне, Божа,
ад зайздроснага вока,
ад людскога пляткарства,
ад прадажных сяброў.
Зберажы мяне, Божа,
ад паспешлівых крокаў.
ад ліхое маланкі,
ад вятроў-скразнякоў.
Зберажы мяне, Божа,
ад нянавісці лютай,
ад глухой адзіноты
у  вірлівым жыцці.
Памажы праз жыццё
быць жанчынаю любай,
быць матуляй ласкавай,
у сэрцы веру нясці!

*   *   *

Я шукаю Яго сляды…
Не! Не там, дзе ступаў ён босы.
Не дайсці мне пакуль туды…
Я шукаю сляды ў нябёсах!
У малітве, што завяшчаў,
У касцёльным кутку ціхуткім.
Ува сне, увайшоўшы ў астрал,
Іх, на радасць, знаходжу хутка.
Чалавечыя дзіва-сляды…
Да якіх так хачу прыпасці!
І, адолеўшы ўсе суды,
Смакаваць напоўніцу шчасце.
Я шукаю Яго сляды…
З моцнай верай. Іх заўважаю
Ў промнях сонца, у  кроплях вады…
І ў далонях сваіх саграваю.
Ува мне Яго вечны след!
Стаць на споведзь зусім не баюся.
Веру: Ён зберажэ ад бед,
Не суджу, не віню…
Малюся!

*   *   *

Не верым… Не чуем… Не хочам
Ні верыць. Ні чуць. Нецікава.
Ён сеяў надзею… Прарочыў…
А мы… На крыж! І цвікамі!
Ён слова нёс Бацькі Бога,
Не здаўшыся на спакусу.
А мы… Здзекі… Боль… Аблога…
І воцат – да смяглых вуснаў.
Вучыў, прабачаў, вылечваў…
І верыў у міласэрнасць.
А мы… Бервяно на плечы!
І дзіду… Пад самае сэрца!
Забраў Ён грахі ўсе нашы,
Пакуты за нас прыняўшы!
А мы…  Перапоўнілі чашу
Цярпення… І суд нам не страшны!
Не хочам… Не чуем… Не верым…
І носім не сэрцы, а глыбы.
У свеце туманна- шэрым,
Што ў жмені трымае…
выбар!

Ці сонца прачнецца сёння?
Згасае цярпенне Бога.
Крываваць Ісуса далоні…
Судзіць прыйдзе ў славе строга!

*   *   *

Бог жывую душу ў гэты свет упусціў,
Чалавека стварыўшы для шчасця.
Каб свабодна пад ветразем мараў ён плыў.
Выбіраў: узляцець або ўпасці.

Даў і розум, і права памылкі здзяйсняць,
Кіраваць сваім лёсам дазволіў:
Усміхацца, злаваць, ненавідзець, кахаць…
А яшчэ – слухаць боскую волю.

І гадае  жывая душа – чалавек:
Зерне веры ўтаптаць ці пасеяць?
Хтось на божых красёнах тчэ свой зямны век,
Хтось калышацца ў люльцы зладзея.

Ёсць такія, што хочуць свой рай на зямлі,
І адпрэчваюць ласку ад Бога.
Вастраверхія  вежы зла-гневу ўзвялі,
Сатанінскай прастуюць дарогай.

Выбар зроблены. Д'яблу рашылі служыць.
І нячыстаму кланяцца рады.
Хоць Хрыстос іх грахі адмаліў на крыжы,
Каб да неба даць шлях, быў распяты.

То не снег і не дождж… Гэта плача сам Бог.
Яго дзеці – прадажнікі. Здрайцы.
Не спыніў іх, не ўпэўніў… Хоць ведаў! Хоць мог!
І жадання няма – апраўдацца.

* * *

Даймае жаданне:
Як бы хоць адным вочкам цікануць,
што там пра мяне ў кнізе боскай напісана?
Колькі лёс адмераў удараў сардэчных?
Ці лічыш іх, анёл мой?
Папярэдзь, шапні, знак дай…
Што хутка…
Каб паспець
з сонцам нагаварыцца,
зоркам-месяцу пакланіцца,
Усявышняму памаліцца,
дзецьмі нахваліцца,
з мужам налюбіцца…
Прымірыцца,
падзівіцца,
развітацца…
Не спі ў шапку, мой анёле!
Бо не паспею за гэтымі -“цца”
да нябёсаў дабрацца?

## *СМАК РАДЗІМЫ*

*   *   *

Шчасце п’ю
з вуснаў любага краю,
рыфмай плачу,
люблю і грашу,
ніву долі дабром засяваю…
Тут мой лёс!
Тут пакіну душу…

**АКРАЛІСТ БЕЛАРУСІ**

**Б**еларусь мая, бела-русая!
**Е**ўрапейская і савецкая.
**Л**егендарная… Ганаруся ёй
**А**дмысловаю, старасвецкаю,
**Р**однай-родненькай! І адзінаю.
**У**нікальнаю. Вернаю Хрысту…
**С**ваёй сіне-льняною Радзімаю.
**І** ў зямлі яе вершам прарасту!

## КРАЙ ЛЮБІМЫ МОЙ

Раніца ружовіцца садам маладым,
Мые вочкі сонныя сонейка над ім.
Туманы бакі свае грэюць над ракой…
Гэта прачынаецца край любімы мой.

Бэзава-рамонкавы дождждык прашуміць,
Расцвіце вясёлкаю неба ўвышыні.
Дзень гулліва бавіцца з матухнай-вясной.
Працай мірнай славіцца край любімы мой.

Запаліў каштан свае свечкі-ліхтары.
Знічка срэбнай кропелькай ярка дагарыць.
Плюшчы свае вочанькі, ціха засынай…
Добрай табе ночанькі, мой любімы край!

**ВЕЧАРОВАЕ**

У пену захаду ружова-залатую
Нырае гарызонт, як немаўля.
Стаю ў зачараванні і смакую,
Імгненні, калі спаць ідзе зямля.
Вячэрняя зара п’е цішу звонкую,
І тчэ ядваб малінавы – акрыць
куточак той, што я заву старонкаю
любімаю. І за які баліць
душа мая. Маліцца не стамлюся
за гэты край. За светлы свой народ,
за мовы лёс, за волю Беларусі,
За Бога непрадбачаны прыход.
Барвовы змрок нябёсаў лоб цалуе –
стаю з замілаваннем у вачах.
І бачу – на зямлю маю святую
ляцяць анёлы з зорамі ў руках!

*   *   *

Вяртаюся дамоў.
З цёплых месц,
з замежных дарог,
з карабля на баль –
Новы год на парозе.
Уладарыць зіма.
Серабрыцца снег.
Охохокае мароз.
Дамачадцы страчаюць:
як да прычасця
ў строях белых –
сосны-сястрыцы.
Настыўшай песняй,
асіплым голасам –
вароты сонныя.
Маўклівымі прыступкамі –
ганак заснежаны.
І дзве ўнучачкі,
каліна ды аронія,
у пальчатках белых,
з падмарожанымі
шчочкамі-ягадкамі.
Схіліліся ў паклоне.
Зрываю іх
дрыготкімі вуснамі
разам са снегам.
Каштую.
Адчуваю
хмель,
горыч,
асалоду…
Дык вось ты які –
**смак Радзімы!**

**КАБ РЭШАТАМ НЕ СЕЯЛІ МЫ ПАМЯЦЬ…**

На свет глядзелі мы з адной калыскі.
І свет нам гэты такі родны, блізкі!
Браты-славяне – рускі з беларусам.
У хатах іх – іконы з Ісусам
Пад ручніком, рукамі вышываным,
І па паўвёскі – Мар’і ды Іваны…
Спяваюць песні нараспеў на святах,
Знаходзяць у капусце немаўлятак.
І голасна галосяць на хаўтурах
Браты-славяне!
Родныя натуры!
Дзяліць радзімнае – барані Божа!
Патрэбна – за свой кут галовы зложым!
Наказы продкаў, песню жаўрукову,
Рамонкаў вейкі і садок вішнёвы
Мы годна беражом!
Браты-славяне!
Разладаў лёд няхай хутчэй растане!
Лунае ўсцяж над Руссю й Беларуссю
Святая птушка наша – горды бусел!
Вайны хай вартавыя – абеліскі –
Напамінаюць, што нягоды блізка!..
Каб рэшатам не сеялі мы памяць.
Насілі ў храм душу на пакаянне.
А ў сны дзяцей і ў вокны нашых хатаў
Ляцелі знічкі… А не жар гарматаў!

**МАЙ 1986**

*Ад дзён тых –*
*шлях*
*у трыццаць пяць*
*гадочкаў*

– Танюшка-сплюшка! Зноў заснула з кніжкай!
Праз паўгадзіны практыка – пад’ём! –
Сяброўка Светка з “вожыкавай” стрыжкай
З воч праганяе мой кароткі сон.
Ускокваю! Гарэзліва, вясёла!
Хутчэй! Спазніцца нельга – быць бядзе!
І з інтэрната да бліжэйшай школы
Бяжым са Светкай – “вучыцелькі” дзве!
Гарачыня! Так сонейка шчыруе!
Чарэшнева-вішнёвы снегапад!
Шпачок старанна песеньку шліфуе –
Схаваўся ў цень смарагдавых прысад.
Вясна! Канец вучобы блізка-блізка!
А справаў! Рой! Калі паспець зрабіць?
Старанныя студэнткі-аптымісткі,
Жыццё мы не стамляліся хваліць!
Бяжым у клас, дзе дваццаць параў вочак
Уважліва на нас будуць глядзець.
І мы так многа расказаць ім хочам
Пра тое, што… Мы зараз у бядзе:
“Не трэба, праўда, моцна хвалявацца…
Не ў нас, на Украіне быў узрыў…
Хоць горача, а трэба прыкрывацца…
Каб кожны на галоўцы ўбор насіў.
І ручкі мыйце з мылам часта-часта,
Кладзіце мокрую анучу ля дзвярэй…

І душ прымайце”…
Гэтае няшчасце
Зусім не насцярожвала дзяцей.
Аварыя?.. За сотні кіламетраў!
Не чуем паху! Не відаць слядоў!
І нам няўзнак: са спадарожным ветрам
Прыплыў на Беларусь пыл палыноў!
І мы ў свае гарэзлівыя дваццаць,
Перасцярогшы нашых малышоў,
З сумленнем чыстым – да ракі – купацца!
Не прыкрываючы ні спін і ні галоў…
…Ад дзён тых – шлях
у трыццаць пяць гадочкаў.
Ды ў памяці – калюжын жаўцізна,
І жоўці след на травеньскіх лісточках…
Са стронцыем і цэзіем вясна!
Яна цярпліва злізвала атруту,
Трывала цмока кіпцюры ў грудзях…
Не адчувалі мы яе пакутаў
І верылі – асілім чорны шлях!

… – Танюшка-сплюшка! Як жыва-здарова?
– Жыву, Святланка! Хоць раман пішы!
Трапеча сэрца ўзбуджана-вяснова,
І вера пасялілася ў душы!
Вясна, як некалі, ва ўсю шчыруе!
Вось-вось павінны вішні зацвісці!
– Господзь! Чарнобыля сляды – прашу я, –
Ні на зямлю, ні ў душы не ўпусці!

**КРАЙ МОЙ**

Белапенна-чаромхавы рай,
Дзе ў калысках гайдаюцца зоры,
Гэта край мой! Дзівосны мой край –
Неба сінь! І смарагду прасторы!

Першы промнік-гарэза паўзе –
Пажаданні на лісціках піша.
Край мой мілы! Вітай новы дзень,
Які тчэ мілагучная ціша.

Сустракаю я дзён веснаход.
П’ю з далоняў дажджынкі святыя.
І шапчу: “Беражы мой народ,
Усявышні! И присно… И ныне!”

Я раней і ўявіць не магла,
Што вось тут, пад ссівелай бярозай,
Буду думаць: “Абы не вайна!..”
Край мой мірны! Даруй мне за слёзы!

* * *

Ранак.
Адвешваю начную фіранку
І не веру вачам сваім:
Ці то выпаў майскі снег,
Ці то ўсе гаспадыні ў вёсцы
Вылілі ранішні сырадой
На мой сад?!

* * *

Замяцеліў вішанькамі май.
Сыпле й сыпле, несупынны гэткі.
Прыгаршчамі поўнымі збірай
У траве пялёсткі, як манеткі.

Языком іх вецер зліжа. Ах!
Не паспее і на смак забыцца –
Вішнямі-каралямі ў садах
Палахліва ліпень загарыцца.

*   *   *

Ах, восень, зноў пра густы дбаеш,
Тваіх адценняў модных не злічыць!
Штогод сваёй руплівасцю здзіўляеш,
Сваім жаданнем радасць падарыць.
Натомішся, завітвай на гарбату,
Я пернікаў салодкіх напяку.
Пагутарым. Асвенцім маю хату,
Бо… колькі таго шчасця на вяку?

**БЕСПАРАСОННАЯ**

Бурштынавыя слёзы позняй восені
Паранілі мяне беспарасонную.
Не, не змяню я да яе адносіны –
Люблю непрадказальна-неўгамонную!

З кудзеркамі лімоннымі і лысую,
У строях залатых і эратычную.
І золкую, і сонечна-іскрыстую.
Лагодную, тужліва-драматычную.

Малінавы адвар у жоўтым кубачку
Разбавіў шэрасць вечара плакучага.
У цішыню захутаюся трубачкай
І прапацею вершамі гаючымі.

...Знайшла для вершаў важкую прычыну!
Наўмысна заўтра  парасон  пакіну.

**ТРЫЯЛЕТ**

Люблю цябе, зямля бацькоў,
Табе не здраджу й пад прымусам.
За гонар – звацца беларусам –
Люблю цябе, зямля бацькоў.
З далёкіх сонечных шляхоў
З паклонам да цябе імкнуся.
Люблю цябе, зямля бацькоў,
Табе не здраджу й пад прымусам!

## ***А ЖЫЦЦЁ НЕ ПАЧНЕШ СПАЧАТКУ…***

### **ПЛАТА**

Жыццё заплаціць спаўна
За думкі, жаданні, дзеянні…
Дарога ва ўсіх адна.
Па-рознаму кожны йдзе яе.

Заплаціць спаўна жыццё
За ўбачанае і за пачутае.
Пасцеле пад бок асцё
Або ў пярыну закутае.

Жыццё заплаціць спаўна
Якой – не ўгадаеш– валютаю.
За шчырасць нальe віна.
За зайздрасць – віна… з атрутаю.

*   *   *

Дзень адышоў.
Спакойны і звычайны.
Яшчэ адзін. Нічым ён не здзівіў.
Прывычна адпішчаў уранку чайнік.
І дождж самотна слёзы свае ліў.

Дзень адышоў.
Не пазваніла блізкім,
І ні радка ў нататнік  не лягло.
Здароўе зноўку турбавала ціскам,
Крыху трывожна на душы было.

А дзень не пажадаў мне
“Добрай ночы!”
Пашлёпаў напрасткі. У небыццё.
Адбіў гадзіннік. Змружваюцца вочы.
...На цэлы дзень паменшала жыццё!

**МАМЕ**

Скача вавёрачкай вогнік у грубцы.
Дыхае цёплай самотай пакой.
Мама ў валёнках і зношанай куртцы
Цэдзіць на кухні вячэрні ўдой.

– Холадна як! Аж да костак праймае,
Грэйся, дачушка, паленцаў падкінь.
Грэюся. Дзіўна, аднак жа, бывае:
Цела гарыць, а ў душы – скразнякі.

Кожны куточак да болю знаёмы,
Кожны разрэз на шпалерах знайду.
Дзе яшчэ будзе так лёгка, як дома?
Ды штось трывогу з душы не зваду.

Мама! Жыццё адлятае, як песня,
Шчасце ты смела ўплятала ў касу.
Лёс і не крыўдзіў цябе, і не песціў,
Употай не раз выцірала слязу.

Мама! Няўмольна гады прамінулі.
З весняй паводкай сплыла маладосць.
Так ужо сталася… Выбач, матуля,
Я ў тваёй хаце сягоння як госць.

Мама! Чаму душу студзіць трывога?
І  успамінамі сэрца лячу?
Вер, што сказаць табе трэба так многа…
Толькі … ”Даруй мне за ўсё!” – прашапчу.

* * *

Адзінокая зорка сустрэла ля роднае хаты.
Месяц вокам з-за хмары міргнуў і схаваўся:
“Прабач”.
Палыселы каштан у траву скінуў дзетак багата,
Прытуліўся галінкаю бэз. Супакоіў: “Не плач!”
Вецер злізвае з твару салёныя пацеркі-слёзы.
І стаю. Сірата. І шукаю святла ў акне.
Не гарыць. Цемната. Не таму, што прыехала
позна.
Не чакаюць. Не стрэнуць… Ні мама, ні тата
мяне.

**СУСТРЭЧА**

Зноў вясна. Зноў палаюць цюльпаны.
Зноў дурманіць чаромха і “шлюбняць” сады.
Зноўку свечку палю за душу тваю, мама,
Не суцішылі боль адзіноты гады.

Колькі часу стаіць сіратой наша хата,
Зарастае сцяжынка да родных варот.
Ціха свечка гарыць за душу тваю, тата,
Спаць спакойна вам разам ужо колькі год.

Пастаю. Памалюся. Размовы не будзе.
Не адкажаце вы на пытанні мае.
Кветкі вам пакладу, мае любыя людзі.
Мае мама і тата.
…Вас так не стае.

* * *

Яна ведае шмат:
Як песні раскрывалі крылы на ўвесь пакой,
Як слёзы білі твар гарачым градам,
Як рукі шукалі прытулку на мілым целе,
Як сшытак глытаў дробныя семкі-літары
Аб добрым, аб крыўдным, аб балючым, аб
перажытым…

Хто ж яшчэ ведае больш,
Чым мая аднавокая пільная сяброўка-лямпа?!

**НАСТРАЁВАЕ**

**А жыццё не пачнеш спачатку**
І памылак не выправіш, не!
Я ўжо выпіла да астатку
Келіх свой…
Хто яшчэ мне нальe
Спадзявання,
            цярпення,
                  ахвоты
                      і развагі,
                            і дабрыні,
                                  і кахання,
                                        і кроплю
пяшчоты?..
Ты?
          Ды келіх і твой пусты...

* * *

Прачнуся каханай… Світанне.
Сабе пазайздрошчу ўпотай.
Прымі, лёс, маё пакаянне
Палітае шчырай самотай.
Спаві яго туга пялюшкай,
Пяшчотна, але надзейна.
Каб не узвілося, як птушка,
Не выпырхнула, не паляцела.
Яшчэ палічу свае вёсны!
Цяплом наталю каханне.
У тым, што цаніць стала позна…
Мой лёсе, прымі пакаянне.

## ХЛЕБАСОЛЬНЫ, ВЕТЛІВЫ, ГАСЦІННЫ…

Яблычны, арэхавы, мядовы,
спасаўскі – апошні месяц лета.
Жнівень мой! Набожна-ганаровы,
доляй мы з табой адной сагрэты.
Сталы, мудры, дбайны, паважаны,
працавіты, шчыры, клапатлівы,
стомлены, заўзяты, ураджайны…
Гэта жнівень! Гаспадар руплівы!
Ружы, астры, цыніі, вяргіні,
хрызантэмы, флёксы каля хаты.
Грушы, слівы, позния маліны…
Гэта жнівень! Шчодры і багаты!
Хлебасольны, ветлівы, гасцінны,
Дзёрзкі, заліхвацкі, жывапісны…
Вяжа гамакі ён з павуціны,
Як дзіця ў іх гойдаецца-вісне.
Зоркамі жанглюе віртуозна,
шэпчацца з ранетамі пад вечар.
Часам крыўду вылівае слёзна,
і баліць яму па-чалавечы…
Не прадзі мне смутку, жнівень родны!
Сонечныя мары мае споўні.
Атулі бацькоўскаю лагодай,
верай і надзеяю напоўні!
Яблычны, арэхавы, мядовы,
спасаўскі – апошні месяц лета.
Жнівень мой! Пад ззяннем месяцовым
мы з табой яшчэ спяём дуэтам!

## ДНЮ ПРЫЙСЦІ ДАЗВОЛЮ…

Захуталіся ў плед туманны зоркі.
На смак спрабуе вокны мае дождждык.
Да костачак прамок світанак золкі.
Сыходзяць сны са спальні асцярожна.

Разліўшы на душы вясёлкі ўсмешку,
На вейках – сарамлівую пяшчоту.
Імгненнямі начнымі думкі цешу…
І так расплюшчваць вочы неахвота.

Спрачацца бессэнсоўна з прачынаннем –
Будзільнік не забудзе сваю ролю!
Спляту са сноў начных ажурны шалік,
Укрыю сэрца. Дню прыйсці дазволю.

* * *

Падае долу кляновы лісток сірацінай,
Чырвань каліны ўлагодзіць трывогу душы,
Луг адцвітае – прывычная воку карціна.
Восені подых. Калючы. Халодны. Чужы.

Ціха кружляюць сняжынкі з бялюткіх аблокаў.
Ружы пад снегам. Іх летам садзіла сама.
След пакідаю на сцежцы. Прыгожы. Глыбокі.
Я ўжо не тая. І больш не здзіўляе зіма.

Дні так бягуць – не зважаеш і нават не лічыш.
Зноў занявесціцца груша ля спальні акна.
Я не гадаю, калі мяне неба пакліча.
Дый без мяне не заблудзіцца, прыйдзе вясна…

## *БЯГУ НА РУЖ ТВАІХ ЦЯПЛО*

### ЧАКАННЕ

Спаланіў душу мне неспакой:
Зноў вальсуе непагода зранку.
Памалюся ў цішыні святой,
На акне не захіну фіранку.

П’ю вачыма васільковы рай.
Дзесьці там, за сотні кіламетраў,
Пра мяне, мой мілы, узгадай
І вітанне шлі мне з цёплым ветрам.

Думкамі цябе дамоў вяду,
Сцежку табе з зораў вышываю.
Адвядзе ліхую хай бяду…
Родны мой, я так цябе чакаю.

* * *

Калі ты не побач,
Малюю твой вобраз
Бяссонніцай
Па вакне, па столі, па цемры....
Ноч сквапная на фарбы –
Атрымліваецца шэра, невыразна.
І толькі месяц,
Спачуваючы мне,
Высвеціў тваю ўсмешку
На спуджаным сонным люстэрку.

**ТРЫЯЛЕТ**

Ты рассмяшыў мяне да слёз
Запозненым лістом прызнання.
І роздумамі пра каханне
Ты рассмяшыў мяне да слёз.
Так, ты  як грэшнік у выгнанні,
Такі табе дастаўся лёс.
Ты рассмяшыў мяне да слёз
Запозненым лістом прызнання.

## СМАК ЛІПЕНЯ

Каменьчык, цюкнуўшы у шыбу,
Даў знак – сустрэчу сьвяткаваць.
Нясмела ты мяне паклікаў
Па кроплі ліпень смакаваць.

Збіралі зёлак пах ля рэчкі,
З рамонкаў мералі вянкі.
І елі спелыя парэчкі–
О, што за цуда смак такі!

Пасля бязглуздай нашай спрэчкі
Ад крыўды слёз мне не стрымаць…
Якія кіслыя парэчкі!
Ну проста нельга ў рот узяць.
.

## ПАДСЛУХАНАЕ Ў ЭЛЕКТРЫЧЦЫ

– Кажаш, не забыў, успамінаеш?
Ну а як жыццё тваё цяпер?
Штось вачэй , гляджу, не падымаеш,
І нясвежы з гальштукам каўнер.
Кажаш, жонка поварам працуе?
Надта не заўважна па табе.
Ну а сам? Камерцыя. Гандлюеш.
А яшчэ? Бывае сніш мяне?
Ну а дзеці? Сын? Увесь у татку.
Малайчына! Як завуць? Ілля.
А чаму хацеў дачку спачатку?
Вось дзівак! Каб даць маё імя…
А жытло? Здымаеш за даляры?
У адведкі, кажаш? Запрашай!
Ты аб чым? Я й зараз твая мара?
Не жартуй!
Ну, мне пара.
Бывай!

## СУСТРЭЧА

Падалося:
на імгненне знік цэлы свет.
Засталіся толькі твае вочы.
Божа! У віхуры гадоў
яны  не страцілі
цеплыні,
глыбіні,
гуллівасці…
Ты маўчыш.
І не трэба
ні пытанняў, ні адказаў.
Ёсць твае вочы!
Якія шкадуюць,
просяцца,
каюцца,
спадзяюцца,
чакаюць…
І хоць мне падалося,
што на імгненне знік цэлы свет,
я апускаю вейкі.
Напэўна, ты паспеў прачытаць
у маіх вачах
адно-адзінае слова:
“Позна!”

**НОЧ БЕЗ ЦЯБЕ**

Па зжаўцелых лістах, па канве-павуціне
Вераснёвая ноч асцярожна сышла.
Пацалункі свае падарыўшы каліне,
Што сцярожыць мой сон каля спальні вакна.

Гэта ноч без цябе… Сіратліва-пустая.
Упляла ў мае думкі трывогу знарок.
Вінавачу, злуюся, шкадую, гадаю…
І, шукаючы слоў, мітусіцца радок.

На пачуцці святло разалье свежы ранак,
Не дазволіць больш правіць трывозе, журбе.
Я бяссонніцы след зарыфмую старанна,
І зап’ю моцнай каваю ноч без цябе.

* * *

Я гэты боль перажыву.
Хоць цераз край – да дна дап’ю.
Мой боль – нацятую струну
Я не парву – перацярплю.

Я гэты боль – агонь-пякун
Залью. Засыплю. Улагоджу.
Мой боль… Раптоўны, як пярун,
Перамалю бяссоннай ноччу.

Я гэты боль перамагу.
Забуду. Залячу. Ты чуеш?
І даравацць табе змагу.
Але ці ты сабе даруеш?..

***

Водар ліпеня. Вечар ліпавы
Зоры-зернейкі высееў густа.
Мы з табою пад ліпамі і на “Вы”
Пальцы ў пальцах сціскаем да хрусту.

Водар ліпаў сплыў. Вечар жнівеньскі
Зоры-зернейкі высееў густа.
Ах, які гэта месяц быў! Ах, які!
Без цябе так самотна, так пуста…

**ПРА КАХАННЕ**

Мароз злаваўся не на жарты.
Не да спатканняў, з хат не руш!
А ты, упэўнены і ўпарты,
Прыйшоў…  з букетам змерзлых руж.

А я ў танюсенькіх панчошках
(У мамы, пэўна, стаўся б шок)
Хавалася аж “да няможна”
У твой кудлаты кажушок.

І не было лістоў бальнічных,
І колькі зім ужо сплыло…
А я ў панчошках эластычных
**Бягу на руж тваіх цяпло**.

***

Жыву на свеце шчыра, без падману.
З падзякай абразы цалую ў храме.
Хоць не хапаю прыгаршчамі манну,
За долю, што дала, удзячна маме.

А Богу ўдзячна, што не душыць зайздрасць
Жаночых думак (рэдкаснае шчасце!),
Людскую што дзяліць умею радасць,
І мне знаёмы споведзь і прычасце.

І мужу ўдзячна! Ён – анёл мой верны.
Мой ветразь. Пашукаць такога мужа!
Яшчэ жыццю я дзякую бязмерна
За шлях з рамонкаў, палыну і ружаў!

## *ЗМЕСТ*

### *Сэрца песню шукае…*

***Дрэва корань пускае
Мова
***Усё ў жыцці бывае ўпершыню
Маё дзяцінства
Прыйдзі, Паэзія
***Калі на душы невыносна смыліць…
Восеньскі настрой
***Нанізваю радкі
Госця жаданая
Трыялет
Малітва
***Я шукаю Яго сляды…
***Не верым… Не чуем… Не хочам
***Бог жывую душу ў гэты свет упусціў
***Даймае жаданне

### *Смак Радзімы*

***Шчасце п’ю
Акраліст Беларусі
Край любімы мой
Вечаровае
***Вяртаюся дамоў
Каб рэшатам не сеялі мы памяць.
Май 1986
Край мой
***Ранак
***Замяцеліў вішанькамі май
***Ах, восень, зноў пра густы дбаеш
Беспарасонная
Трыялет

## *А жыццё не пачнеш спачатку*

Плата
*** Дзень адышоў
Маме
*** Адзінокая зорка сустрэла ля роднае хаты
Сустрэча
***Яна ведае шмат
Настраёвае
*** Прачнуся каханай… Світанне
Хлебасольны, ветлівы, гасцінны
***Дню прыйсці дазволю
*** Падае долу кляновы лісток сірацінай

## *Бягу на руж тваіх цяпло*

Чаканне
*** Калі ты не побач
Трыялет
Смак ліпеня
Падслуханае ў электрычцы
Сустрэча
Ноч без цябе
*** Я гэты боль перажыву
***Водар ліпеня. Вечар ліпавы
Пра каханне
*** Жыву на свеце шчыра, без падману

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**ЦВІРКО Таццяна Канстанцінаўна**

# СЭРЦА ПЕСНЮ ШУКАЕ

Вершы

Рэдактар
*Н. І. Мельнічэнка*

Дызайн вокладкі
і камп'ютарная вёрстка
*Л. У. Гатавіцкая*

ГА "Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі".
Пл. Свабоды, 13-1, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: 8(017) 347 08 60.
E-mail: maaspb.m@yandex.by
www.maaspb.by